# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

26 КАСТРЫЧНІКА 1995 года
чацвер

№15 (1732)


*Зазірніце*

## Музей на юрыдычным факультэце: мінулае і сучаснасць

Музей на юрфаку быў створаны ў 1985 годзе, дзякуючы намаганням студэнтаў і выкладчыкаў факультэта. Калі ж называць канкрэтныя імёны, то галоўныя арганізатары — выкладчыкі Гарэлік Іосіф Аляксеевіч, Бабій Мікалай Аляксеевіч і студэнцкая група "Поиск".

Невялікую экскурсію для мяне (і чытачоў "Беларускага універсітэта") правяла загадчык музея, дацэнт, кандыдат гістарычных навук, выкладчык па адміністрацыйнаму праву Лідзія Паўлаўна Максімава.

Першы стэнд прысвечаны прававаму аддзяленню факультэта грамадскіх навук (менавіта пад такой назвай у 1921 годзе пачаў сваю дзейнасць юрфак). У якіх умовах даводзілася займацца першым студэнтам лепш за ўсё расказжа урывак з успамінаў прафесара Вальфсона С.Я.:

"Аудитория нередко представляла сотенную толпу, которая стояла среди четырёх стен и напряжённо слушала лектора. Стояли студенты: не было кресел. В галошах, пальто, кожухах, некоторые с поднятыми воротниками. А в факультетской канцелярии писали в перчатках и карандашами: чернила замерзали. Но университет жил..."

Вось яны, першыя выкладчыкі, выпускнікі: У.І.Пічэта, першы рэктар БДУ, Кроль М.Б., прафесар, Усевалад Ігнатоўскі, першы дэкан факультэта і іншыя. З крыху пацягнутых павуціннем гісторыі фотаздымкаў глядзяць людзі, якія сталі каля вытокаў сучаснай юрыдычнай навукі.

Звярніце ўвагу на гэты цікавы дакумент: у сярэдзіне дваццатых гадоў на факультэце было ўстаноўлена раўнапраўе моў. Выкладанне вялося на беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Наступны стэнд — новы этап у гісторыі факультэта. І распавядае ён пра перыяд з 1932 (год перайменавання ў Мінскі юрыдычны інстытут) па 1953 (стаў юрыдычным факультэтам БДУ).

А вось стэнд, перад якім Лідзія Паўлаўна крышачку панізіла голас. Салдацкая каска і пажоўклыя пісьмы-трохкутнікі не пакідаюць сумнення — суровыя гады вайны. Вось "вогненны выпуск". 41-га. Амаль кожнае трэцяе прозвішча напісана чырвоным — яго ўладальнік не вярнуўся з фронту. І зноў фотаздымкі, пісьмы, успаміны салдат, партызан, падпольшчыкаў. Тут жа і фота, якое абышло ўсе міжнародныя выставы, друкавалася вядомымі выданнямі — " Ленінград. Ліпень 1941 года. Калона байцоў народнага апалчэння накіроўваецца на фронт". На пярэднім плане — А.В.Дулаў, прафесар юрфака, які і сёння працуе на факультэце.

Стэнды, прысвечаныя пасляваенным гадам, расказваюць пра выпускнікоў юрыдычнага факультэта. Яны займалі і займаюць зараз самыя адказныя пасады ў дзяржаве. Расказваюць пра іх лёсы. Часта трагічныя — прафесія сапраўды цяжкая. Прыклад гэтаму — трагедыя, якая адбылася ў 1967 годзе ў Слуцку. Выпускніца 1949 года, народны суддзя Аляксеева Г.І. загінула ў будынку суда пры пажары, падстроеным незадаволенымі яе рашэннем роднымі падсудзімага.

Стэнды з сучаснымі фотаздымкамі распавядаюць пра падзеі, якія мне знаёмыя не па падручніках гісторыі. Для Лідзіі Паўлаўны больш таго, яны — частка яе жыцця. Са студэнтамі, якія праходзілі воінскую службу ў Афганістане, Лідзія Паўлаўна арганізавала выступленні, а сабраныя грошы пералічылі на будаўніцтва помніка воінам-афганцам.

Шмат чаго цікавага можна даведацца аб гісторыі і сучаснасці юрыдычнага факультэта БДУ з экспазіцыі музея. Але галоўнае — я зразумела, што музей — гэта не толькі летапісец, але і актыўны стваральнік гісторыі факультэта. Пры музеі дзейнічае гісторыка-культурны цэнтр і Асацыяцыя свабоднай студэнцкай моладзі. Сустрэчы выпускнікоў факультэта, ветэранаў вайны і працы, канцэрты, КВЗ і іншыя мерапрыемствы — выдатны матэрыял для экспазіцыі. Вось і зараз Лідзія Паўлаўна разам са сваімі памочнікамі: Леанідам Мішэніным, Вадзімам Пазняком, Эльдарам Сафаравым і іншымі студэнтамі, — занятая падрыхтоўкай святочнага вечара, прысвечанага 70-годдзю Першага выпуску юрыстаў, які адбудзецца 10 лістапада ў Палацы культуры чыгуначнікаў.

**Наташа Савельева**

*Канферэнцыі*

На філалагічным факультэце БДУ 17-20 кастрычніка адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай", асноўным арганізатарам якой выступіла кафедра рускай літаратуры. Даследчыкі з усёй Беларусі, а таксама запрошаныя навукоўцы з Македоніі (д-р Блажа Рыстоўскі), Украіны, Польшчы, Расіі змаглі прыняць удзел у рабоце секцый "Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах", "Заходнееўрапейскія традыцыі ў славянскіх літаратурах" і інш. Па выніках работы канферэнцыі плануецца выдаць зборнік тэзісаў.

***Больш падрабязна аб выніках канферэнцыі "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай" чытайце ў наступным нумары.***

**Зміцер Дзядзенка**

*Выставы*

Выстаўка кніг выдавецтва "Хрысціянская Расія" (Мілан, Італія) з 19 па 21 кастрычніка праходзіла на факультэце тэалогіі Еўрапейскага Гуманітарнага Універсітэта, у бібліятэцы БДУ і ў кнігарні "Падпісныя выданні". Увазе наведвальнікаў была прапанаваная літаратура (кнігі, часопісы) на рускай і італьянскай мовах па тэалагічнай, філасофскай і культуралагічнай тэматыцы, а таксама маляўнічыя царкоўныя календары на 1996 год.

## Аб шкодзе курэння

***З інструкцыі "Аб парадку пераводу, аднаўлення і адлічэння студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў".***

***4.1.Студэнт можа быць адлічаны з ВНУ:***
***— па асабістым жаданні;***
***— у сувязі з пераводам у іншую ВНУ;***
***— па стану здароўя на аснове даведкі УКК;***
***— за акадэмічную непаспяховасць;***
***— за сістэматычнае парушэнне вучэбнай дысцыпліны і правілаў унутранага распарадку ВНУ.***

Як вядома, больш за ўсё адлічаных сярод студэнтаў — з фармуліроўкай "За акадэмічную непаспяховасць". Але сустракаюцца і іншыя, прыкладам чаму нядаўні выпадак на юрфаку. Дзве студэнткі завочнага аддзялення былі адлічаныя за курэнне ў неадведзеным для гэтага месцы. Ходзяць чуткі, што заўвагу ім зрабіў сам дэкан...

*Чытальная зала*

## Тэматычныя прагляды кніг

Чытальная зала бібліятэкі філфака БДУ перыядычна ладзіць тэматычныя прагляды кніг, якія маюцца ў яе фондах. Мэта такіх мерапрыемстваў — даць студэнтам і выкладчыкам уяўленне аб літаратуры, якую ім можа прадаставіць чытальная зала. Так, 16-19 кастрычніка прайшоў прагляд кніг па эканоміцы, які наведалі каля 200 чалавек. Тут былі прадстаўленыя даследаванні па тэорыі і гісторыі эканамічнай думкі, па сучаснаму стану айчыннай і замежнай эканомікі.

У бліжэйшых планах работы чытальнай залы прагляд кніг на замежных мовах ( румынскай, чэшскай, балгарскай, нямецкай, польскай і інш.). "Мы хочам,— кажуць супрацоўнікі чытальні,— каб і выкладчыкі, і студэнты ведалі, якую літаратуру яны могуць выкарыстаць у падрыхтоўцы да заняткаў".

Адна толькі бяда ў чытальнай залы. Як зазначыла загадчыца аддзела масавай работы Святлана Ільінічна Грыгор'ева, студэнты пастаянна скардзяцца на нястачу літаратуры: амаль уся яна асядае ў галоўным корпусе. " Няхай бы там заставаўся толькі кантрольны экземпляр, а ўсе астатнія асобнікі ішлі сюды, бліжэй да студэнтаў,"— лічаць бібліятэкары.

**Зміцер Дзядзенка**

*Коратка*

Начальнік аддзела па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта Аляксей Багдановіч вярнуўся нядаўна з Масквы, дзе прыняў удзел у канферэнцыі Расійскага Саюза моладзі, якая праводзілася ў Інстытуце моладзі. У рабоце канферэнцыі прымала ўдзел Еўразійская студэнцкая асацыяцыя, і Аляксей Багдановіч абраны яе віцэ-прэзідэнтам.

***

З 25 кастрычніка ў Доме літаратара адкрываецца кінапаказ нямецкага камедыйнага кіно. Праграму падрыхтавала федэрацыя "Кінаклуб" (Мінск) сумесна з інстытутам Гётэ (Германія).

*Віншуем!*

Студэнтка 5-га курса біяфака Машара Даша, майстар спорту міжнароднага класа, заваявала тытул віцэ-чэмпіёнкі свету па кікбоксінгу ў Штутгарцэ (Германія).

*Сакрэт фірмы*

Абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсу ў Нацыянальны аўтаномны універсітэт Мексікі — самую вялікую ВНУ краіны, узялі штурмам... рэктарат.

Каля 150 адрынутых прэтэндэнтаў, павыбіваўшы шыбы, забраліся ў калідоры рэктарата і павыганялі службоўцаў. Жыццё універсітэта практычна спаралізаванае. Умовай вызвалення будынка "захопнікі" назвалі адстаўку рэктара.

Яшчэ ў жніўні абітурыенты, якія не здалі ўступныя экзамены, пачалі заяўляць, што пры прыёме дапускаліся злоўжыванні. Паводле іх слоў, некаторыя выкладчыкі за даволі высокую плату прадавалі адказы экзаменацыйных апытальных лістоў. Адміністрацыя універсітэта абвергнула гэтыя абвінавачванні. Тады з няўдалых абітурыентаў была створаная група, якую назвалі "адрынутымі". Для пачатку 16 чалавек з гэтай групы правялі галодную забастоўку, якая цягнулася больш за месяц...

# Клуб вясёлых і знаходлівых Белдзяржуніверсітэта

## *(шляхам жыцця)*

***Ведай нашых!***

*Клуб вясёлых і знаходлівых БДУ існуе ўжо пяць год.*

*У 1992 годзе ён стаў чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь.*

*У 1993 годзе — удзельнік фестывалю КВЗ Астанкіна ў Варонежы.*

*Тры сезоны запар гуляюць у клубе. З'яўляюцца членамі Вышэйшай Лігі. Каманда -- адна з асноўных у клубе, і нават трапіла ў асобны спіс.*

*Па словах рэжысёра, яна атмасфера ўсяго клуба. І пацверджанне гэтаму — асабістая сімпатыя Маслякова і ўсёй яго сям'і.*

*Склад каманды фарміраваўся на працягу доўгага часу. У ёй аб'яднаныя людзі з розных гарадоў Беларусі ( Мінска, Салігорска, Віцебска, Брэста).*

*Зараз яны рыхтуюцца да паўфінала і запрашаюць сваіх прыхільнікаў да тэлеэкранаў.*

*У гэты момант нашы "кавээншчыкі" зарабляюць грошы на дарогу ў Маскву, бо клуб ніякага прыбытку не дае, ён трымаецца толькі на фанатызме ўдзельнікаў. Маслякоў не бярэ ні капейкі, але і не плаціць.*



***Аляксандр Аляксандравіч Гаўрыльчык.***

Скончыў ФПМ БДУ. 5 гадоў займаецца КВЗ і кідаць не збіраецца, бо людзі добрыя там, звыкліся ўжо адзін з адным.

Займаецца ў КВЗ практычна ўсім і асабліва рэкламнай дзейнасцю.

Настолькі шчаслівы тым, што ўдзельнічае ў гэтай справе, што нават не мае часу задумвацца над галоўнай думкай жыцця. (Дарэчы, жыццё — яго хобі.)

Пра сябе кажа, што раней ці пазней будзе загублены схільнасцю да кампрамісаў.

Калі-нікалі бывае вельмі жорсткім, хаця, магчыма, лісівіць сабе.

БДУ — выдатны універсітэт, і Аляксандр ні кроплі не шкадуе, што вучыўся ў ім. Задаволены, што, дзякуючы іх калектыву, у іншых краінах СНД больш людзей ведае пра БДУ.

КВЗ займаецца дзеля:

1. сябе
2. універсітэта
3. рэспублікі

і імкнецца абудзіць у беларусаў гонар за сваю дзяржаву.

Лічыць, што сябрам яго пашанцавала, але перш за ўсё пашанцавала яму.



***Мікалай Сцяпанавіч Анішчанка.***

... Асістэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі. Займаецца навукай і мае працы, апублікаваныя ў ЗША, Японіі, Галандыі. Але КВЗ не дае аб'яднаць усё гэта ў дысертацыю. Піша алеем беларускія пейзажы і партрэты родных. Спявае ў акадэмічнай харавой капэле БДУ. Але душа разрываецца паміж фізікай і КВЗ.

Сваіх сяброў лічыць бязмежна таленавітымі, класнымі хлопцамі. Талент гэты робіць КВЗ камандным відам мастацтва.

"Калектыўная творчасць гучыць занадта афіцыёзна, але гэта якраз той самы прыклад, калі калькасць сабраных разам людзей пераходзіць у якасць".

Першы раз у КВЗ Мікалай пачаў гуляць яшчэ ў школе. Потым уваходзіў у зборную БДУ-МДМІ, якая стала чэмпіёнам Беларусі ў 1989 годзе.

Удзельніцтва ў КВЗ на Астанкіна дазволіла ўсім зразумець наколькі важны і як высока ацэньваецца Сапраўдны Прафесіяналізм.

Дэвіз: Усё, за што бярэшся, трэба рабіць дасканала.

КВЗ — гэта сапраўднае жыццё!



***Сяргей Віктаравіч Алехнік (Бора).***

Хобі: аспірант факультэта прыкладной матэматыкі. Спецыяльнасць — тэорыя верагоднасці.

КВЗ — аддушына ў гэтым шэрым жыцці.

Сям'я — асноўнае захапленне Сяргея, якое займае амаль увесь яго час. Як бачым, аддушына і захапленні ёсць, засталося знайсці толькі працу. Калі б быў час, ён бы хадзіў на рыбалку, але быццё вызначае свядомасць.

Дэвізы:

1. Жыві сам і не перашкаджай жыць іншым.
2. Калі нешта здарылася, дык гэта павінна было здарыцца.

Пажаданне: Няхай людзі, прадстаўляючыя рэспубліку, больш ёю цэняцца. Але, на жаль, гэтага не здарыцца, пакуль адсутнічае нацыянальная ідэя.



***Леанід Купрыда.***

Жыве і працуе ў Салігорску. З'яўляецца галоўным рэдактарам незалежнай тэлекампаніі "Салтэк".

Гаварун, жартаўнік, дасціпнік, добра расказвае анекдоты.

Як і Бора, сінтэтычны акцёр.



***Наталля Рыгораўна Пятрэнка.***

Настаўніца музыкі і спеваў у СШ № 42. Любіць сваю работу. У камандзе 2 гады. Працавала ў лагеры "Гарызонт" старшай важатай. Каманда там выступала і, пабачыўшы Наталлю, была захоплена яе падабенствам да Алы Барысаўны. Андрэй Пятровіч (галоўны рэжысёр) і Саша (адміністратар) не прамінулі гэткага таленту і запрасілі ў каманду.

Мае дачушку-першакласніцу, любіць людзей і вязаць (першае — патэнцыяльна). Кідаецца ў справу з галавой (нават калі не трэба). Не выносіць здрады, але любіць сюрпрызы. Вясёлая, энергічная, ніколі не сумуе. Каманда — гэта тое, што не кожны мае ў жыцці. Тут ніхто ні ад каго не залежыць, гэта душа, якая час ад часу збіраецца. Не апошнюю ролю адыгрывае і інтэлігентная публіка.

Самай цікавай, прыязнай і таленавітай, калі выкрасліць сваю, лічыць каманду Харкава.



***Сяргей Мікалаевіч Турбан.***

Рэжысёр каманды. Любіць тэатр. Зараз працуе над "Царом Максіміліянам" у фальклорна-этнаграфічным гуртку "Неруш", які падтрымліваецца фондам Сораса і існуе ў БДУ ўжо 15 год.

Больш за ўсё думае пра прафесійную дасканаласць.

Лічыць членаў сваёй каманды творчымі людзьмі — сапраўднымі прафесіяналамі.



***Дзяніс Міхайлавіч Варанцоў.***

Скончыў музычную школу ў Мінску і зараз вучыцца на апошнім курсе музычнага вучылішча.

Трапіў у каманду у 1993 годзе, калі праходзіў рэспубліканскі турнір. Раптам да яго падышоў малады хлапец:

— Не жадаеш удзельнічаць у КВЗ?

— Жадаю.

— Ну, дык паўдзельнічаеш.

Яны разышліся, і Дзяніс забыўся на гэтую размову. І раптам званок: "Праз тыдзень едзем." "?!"—...

Прынялі яго шыкоўна. Загадзя абзваніў сваіх сяброў:"Глядзіце!" А па тэлебачанню не паказалі... (Трагедыя жыцця).

Як і ўсе нармальныя людзі, Дзяніс думае пра будучыню сваіх нашчадкаў. Клапоціцца аб тым, каб зберагчы для іх адзіную спадчыну — Радзіму.

Захапляецца футболам, любіць чытаць Рэмарка і В.Быкава, хаця і не згаджаецца з некаторымі меркаваннямі апошняга.



***Валянцін Карпушэвіч*** — капітан каманды. Скончыў факультэт прыкладной матэматыкі БДУ. Жыве і працуе ў Брэсце. Не жанаты. Захапляецца гульнёй у брыдж.

Аптыміст па натуры, жыве сённяшнім днём. Але, нягледзячы на тое, што шалёна любіць сваю каманду, карыстаецца яе шалёнай нянавісцю. Вартая жалю, мізэрная, скрытная асоба. У вышэйшай ступені сквапны чалавек, якому ненавісныя ўсе, хто вышэй, шырэй, даўжэй і больш за яго. Шуму шмат, карысці мала. 133 разы звальняўся і 134 разы быў прыняты назад. Прыязджае на рэпетыцыю толькі дзеля таго, каб азмрочыць жыццё астатнім.

Мноства дрэнных звычак, але па начах не храпе.

(Пры самаацэнцы вялікую ролю адыгрывае надвор'е...)



***Валерый Мікалаевіч Шахаўцоў.***

Жыве ў Салігорску, працуе на шахце.

У КВЗ часцей за ўсё выступае у музычных паўзах, бо вельмі любіць танцаваць. Захапляецца рыбалкай, паляваннем, грыбамі і водным турызмам.

Галоўнае ў жыцці -- сям'я.

Перад сабой ставіць дзве мэты:

1. Вырасціць сына добрым чалавекам і забяспечыць яму "жыццё на ўзроўні".
2.Ператварыць гэтае самае жыццё ў КВЗ.

Нешматслоўны, вясёлы, просты, ні на чым не эканоміць.

З жывёл падабаюцца сабакі, пераважна аўчаркі. Лепшы сябар — Лёня.

Лічыць, што самы спакойны чалавек у камандзе яе капітан (яго проста немагчыма вывесці з сябе).



***Кірыл Іванавіч Цішчанка.***

Скончыў механіка-матэматычны факультэт БДУ. У КВЗ выконвае ролю аднаго з аўтараў.

Вольнага часу няма. Любіць слухаць музыку. Гумар падабаўся заўсёды, але найбольшую да яго цягу адчуў на 2-3 курсе. Пачаў запісваць смешныя выказванні. Потым быў выязны конкурс, галоўнай тэмай якога з'яўляліся куплеты, а трэба сказаць, што Кірыл лічыў сябе спецыялістам ў гэтай справе. Ён пайшоў у КВЗ і прапанаваў свае куплеты. Яго паслухалі і выказалі свае ўражанні:"Музыка добрая, а вось словы трэба перапісаць."

Членам КВЗ БДУ Кірыл стаў, калі іх каманда распалася (засталося некалькі чалавек) і была вывешана аб'ява аб наборы новых людзей. Ён прапанаваў сябе і быў прыняты.

КВЗ у Кірыла асацыіруецца з катаржнай працай.

Мае пэўныя здольнасці да матэматыкі і многія лічаць, што ён не тым займаецца. У такіх умовах цяжка працаваць. Задаволіць каманду жартамі — яго маленькая, але канкрэтная справа.

Пра сябе можа сказаць толькі тое, што не чытаў Ільфа і Пятрова, Жванецкі выклікае ў яго стан блізкі да дэпрэсіі. Падабаецца Фейхтвангер і Драйзер, а Набокаў уражвае Кірыла сваёй інтэлектуальнасцю.

*Усе члены каманды — цудоўныя людзі, і, незалежна ад вынікаў наступнай гульні, яны застануцца гонарам БДУ.*

***Матэрыял паласы падрыхтавала студэнтка І курса факультэта журналістыкі БДУ Валерыя Аўсяннік***

***Фота Тамары Саўчанкі***

*Канферэнцыі*

# Геафак пачаў падрыхтоўку спецыялістаў-дэмографаў

З мінулага навучальнага года пры кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін вядзецца падрыхтоўка географаў па спецыялізацыі “Дэмаграфія”.

Група студэнтаў ( спярша 9-10 чалавек) рыхтуецца да працы ва ўсіх арганізацыях і ўстановах, якія займаюцца праблемамі сацыяльна-дэмаграфічнага развіцця Рэспублікі Беларусь ( служба занятасці насельніцтва, спецыяльныя службы пры адміністрацыйных установах, міграцыйная служба, навуковыя дэмаграфічныя падраздзяленні, вучэбныя ўстановы і інш.).

Будучы спецыяліст-дэмограф павінен добра ведаць сутнасць і праяўленне складаных сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў, методыкі іх вывучэння, аналізу і рознабаковай ацэнкі, прынцыпы і меры сацыяльна-дэмаграфічнай палітыкі, вопыт замежных краін у яе ажыццяўленні, шляхі яе рэалізацыі ў канкрэтных умовах Рэспублікі Беларусь.

З мэтай глыбокай тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўкі пачынаючы з другога курса студэнты спецыялізацыі “Дэмаграфія” праслухаюць цыкл агульнатэарэтычных дысцыплін, у ліку якіх “Асновы дэмаграфіі”, “Дэмаграфічная гісторыя”, “Сацыяльная і эканамічная дэмаграфія”, “Дэмаграфія сям’і”, “Працоўнае і сямейнае права” і інш.

Метадычная падрыхтоўка дэмографаў уключае цыкл такіх прадметаў, як “Дэмаграфічная статыстыка”, “Методыка дэмаграфічнага аналізу і картаграфавання”, “Методыка распрацоўкі геадэмаграфічных інфармацыйных сістэм”, “Дэмаграфічны прагноз і мадэліраванне”, практыкум па камп’ютэрнай апрацоўцы геадэмаграфічнай інфармацыі.

Студэнты падраздзялення будуць падрабязна вывучаць асаблівасці дэмаграфічных працэсаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у параўнанні з іншымі краінамі свету, спецыфіку мясцовых сацыяльна-дэмаграфічных праблем і шляхі іх вырашэння, удзельнічаць у спецыяльных дэмаграфічных абследаваннях.

Акрамя ўласных сіл да чытання лекцый будуць запрашацца вядучыя спецыялісты ў гэтай галіне з акадэмічных інстытутаў, навукова-практычных падраздзяленняў, прадстаўніцтва ААН у Беларусі, з замежных навучальных устаноў. Напрыклад, з Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі, супрацоўнікам якога з’яўляецца выпускнік і аспірант кафедры Ю.Р.Міснікаў, наладжаны асабліва плённыя сувязі. Дзякуючы ім студэнты-дэмографы атрымалі магчымасць знаёміцца з самай найноўшай інфармацыяй аб дэмаграфічнай сітуацыі ў свеце, сустракацца з прадстаўнікамі ААН, з дэмографамі краін Еўропы, працаваць у навуковай бібліятэцы Прадстаўніцтва і глыбей вывучаць англійскую мову, слухаць лекцыі вядучых супрацоўнікаў.

Практычная падрыхтоўка спецыялістаў-дэмографаў будзе ажыццяўляцца праз розныя формы вучэбна-даследчай практыкі як на ўласнай базе, так і на базе многіх сумесных устаноў Беларусі, а таксама навучальных устаноў і дэмаграфічных цэнтраў замежных краін. З мэтай больш кваліфікаванай падрыхтоўкі спецыялістаў пры кафедры створана студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя рэгіянальных дэмаграфічных даследаванняў. Група студэнтаў-дэмографаў з першых дзён навучання будзе непасрэдна займацца навуковымі даследаваннямі актуальных праблем сацыяльна-дэмаграфічнага развіцця ў свеце і ў Беларусі. Яе падрыхтоўка будзе адбывацца па прынцыпу “без добрых ведаў і навукова-практычнай працы не можа быць добрага спецыяліста”.

Вынікі навуковых даследаванняў будуць пакладзены ў аснову курсавых і дыпломных работ, у навукова-практычныя распрацоўкі для зацікаўленых заказчыкаў.

Адной з умоў кваліфікаванай падрыхтоўкі дэмографаў з’яўляецца дасканалае вывучэнне і свабоднае валоданне замежнай мовай (пераважна англійскай). Таму заняткі па замежнай мове будуць не менш за 3-4 разы ў тыдзень. Але пакуль што кафедра замежных моў не забяспечыла такі расклад заняткаў. Відаць, давядзецца звяртацца па дапамогу да спонсараў.

Такім чынам, працаваць давядзецца шмат, але карысна, плённа і цікава. Каму спадабалася такая спецыяльнасць і каго задаволілі прапанаваныя ўмовы вучобы і працы, прыйшлі ў групу дэмаграфіі. Мы імкнемся, каб у гэтай групе былі прадстаўнікі з кожнай вобласці Беларусі і з Мінска (у мэтах працаўладкавання), якія добра ведаюць англійскую мову (каб аб’яднаць групу ў час заняткаў), жадаюць працаваць са шматлікай статыстычнай інфармацыяй і ўдзельнічаць у тэрытарыяльных дэмаграфічных даследаваннях.

Спецыялізацыя па дэмаграфіі немагчымая без шчыльных кантактаў з сумежнымі факультэтамі БДУ. Напрыклад, да факультэта прыкладной матэматыкі ёсць просьба дапамагчы ў выкладанні спецкурса “Дэмаграфічны прагноз і мадэліраванне”, да юрыдычнага факультэта — просьба выкладаць спецкурс “Сямейнае і працоўнае права”. Гісторыкі маглі б выкладаць цікавы курс “Этнічная гісторыя Беларусі”.

Такое міжфакультэцкае супрацоўніцтва ва ўмовах дэфіцыту фінансавых сродкаў дапаможа развіваць разнапрофільную падрыхтоўку спецыялістаў уласнымі сіламі, шляхам пераразмеркавання вучэбнай нагрузкі паміж сумежнымі кафедрамі і факультэтамі, не выдаткоўваючы сродкі на пагадзінную аплату. Такое ж супрацоўніцтва на ўмовах узаемадапамогі неабходнае і для правядзення практычных заняткаў. Напрыклад, практыкум па камп’ютэрнай апрацоўцы дэмаграфічнай інфармацыі немагчыма ажыццявіць без выкарыстання спецыяльна абсталяванага класа, якім валодае матэматычны факультэт. Таму ёсць прапанова вучэбна-метадычнаму цэнтру БДУ, каб ён у пачатку новага навучальнага года сабраў даведкі з факультэтаў аб формах і сродках супрацоўніцтва паміж імі ў мэтах больш якаснага і эканамічна выгаднага ажыццяўлення навучальнага працэсу.

З прапановамі просім звяртацца на кафедру эканамічнай геаграфіі замежных краін геаграфічнага факультэта ( кабінет 215 ).

**Б.А.Манак, навуковы кансультант і кіраўнік спецыялізацыі “Дэмаграфія”**

*Афіцыйна*

# Палажэнне аб арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў Белдзяржуніверсітэце

***4 раздзел. Парадак накіравання студэнтаў універсітэта для навучання за мяжу***

Беларускі дзяржаўны універсітэт падтрымлівае праграмы міжнародных абменаў студэнтаў. Белдзяржуніверсітэт спрыяе ў афармленні неабходных дакументаў студэнтам, якія атрымалі персанальнае запрашэнне для праходжання практыкі, удзелу ў канферэнцыях, міжнародных маладзёжных праектах і г.д. за мяжой. Парадак афармлення дакументаў у гэтых выпадках такі ж, як і пры афармленні выезду за мяжу супрацоўнікаў універсітэта.

Студэнт, які выязджае за мяжу на поўны курс навучання ці для ўключанага навучання на тэрмін больш за 6 месяцаў, атрымлівае дазвол на выезд з магчымасцю ўзнаўлення навучання.

Па вяртанні з-за мяжы аддзел кадраў студэнтаў па прадстаўленню дэканата факультэта на падставе пісьмовай заявы студэнта ў тыднёвы тэрмін рыхтуе загад аб узнаўленні навучання ў Белдзяржуніверсітэце студэнта, які вярнуўся. Загад у абавязковым парадку візіруецца ва ўпраўленні па міжнародных сувязях універсітэта. Для пераводу на наступны курс навучання студэнт можа здаць неабходныя экзамены і залікі па індывідуальнаму графіку, што адлюстроўваецца ў загадзе аб узнаўленні навучання. Адна з копій загада перадаецца ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта.

За студэнтам, які выязджае за мяжу для навучання на тэрмін больш за тры месяцы, стыпендыя не захоўваецца.

Студэнты, якія выязджаюць за мяжу на працяглы тэрмін, маюць права паралельнага навучання ў Белдзяржуніверсітэце на завочным аддзяленні.

Белдзяржуніверсітэт імкнецца пашыраць уласныя магчымасці ў накіраванні студэнтаў для навучання за мяжу. З гэтай мэтай заключаюцца адпаведныя дагаворы, пагадненні з міжнароднымі арганізацыямі, навучальнымі ўстановамі. Адбор кандыдатаў робіцца Саветам па міжнароднаму супрацоўніцтву Белдзяржуніверсітэта з ліку выдатна паспяваючых студэнтаў з добрым веданнем адпаведнай замежнай мовы на падставе прадстаўленняў дэканатаў факультэтаў.

***5 раздзел. Парадак запрашэння і прыёму замежных спецыялістаў у Белдзяржуніверсітэце***

З мэтай пашырэння міжвузаўскіх кантактаў, выканання рабочых праграм, для чытання лекцый і г.д. Беларускі дзяржаўны універсітэт запрашае замежных спецыялістаў. Права запрашэння замежных спецыялістаў у БДУ мае рэктар, а ў яго адсутнасць — асоба, якая яго замяшчае.

Падраздзяленне, зацікаўленае ў запрашэнні замежнага навукоўца, накіроўвае службовую запіску рэктару Белдзяржуніверсітэта з падрабязным абгрунтаваннем неабходнасці прыезду гэтага спецыяліста, указаннем умоваў прыёму і крыніцы фінансавання. Пасля прыняцця станоўчага рашэння ўпраўленне па міжнародных сувязях падрыхтоўвае запрашэнне, якое рэгіструецца ў спецыяльным журнале. Арыгінал запрашэння, падпісаны рэктарам універсітэта і завізіраваны ва ўпраўленні замежных сувязей Міністэрства адукацыі і навукі, накіроўваецца замежнаму спецыялісту для атрымання ўязной беларускай візы. Копія запрашэння захоўваецца ва ўпраўленні па міжнародных сувязях універсітэта.

Аплата прабывання замежнага спецыяліста ў Белдзяржуніверсітэце можа рабіцца як з асабістых сродкаў запрошанага, так і з бюджэту універсітэта, а таксама з сродкаў, выдзеленых на выкананне адпаведнай навуковай тэмы тому падраздзяленню БДУ, якое прымае запрошанага. Фінансаванне прабывання замежнага спецыяліста з бюджэтных сродкаў залежыць ад фінансавых магчымасцей Белдзяржуніверсітэта. Парадак выдзялення такога кшталту сродкаў, іх аб’ём, размеркаванне паміж падраздзяленнямі рэгламентуецца загадам рэктара. Умовы фінансавання прабывання замежнага спецыяліста ўказваюцца ў рэзалюцыі рэктара (першага прарэктара).

Арганізацыя прыёмаў замежных дэлегацый, якія прыбываюць у БДУ на ўзроўні рэктарата, ускладаецца на ўпраўленне па міжнародных сувязях БДУ.

Спецыялісты, запрошаныя ў Белдзяржуніверсітэт у рамках заключаных раней дагавораў аб міжвузаўскім супрацоўніцтве і вынікаючых з іх рабочых праграм тэрмінам да 15 дзён, забяспечваюцца бясплатным жыллём.

Партнёрскае падраздзяленне ў Белдзяржуніверсітэце падрыхтоўвае праграму прабывання запрошанага спецыяліста, каштарыс выдаткаў, прызначае адказнага за прыём, які арганізуе сустрэчу, браніраванне зваротных білетаў, праводзіны спецыяліста, рэзервіруе жыллё, адказвае за рэгістрацыю замежнага грамадзяніна ў органах АВІР. Для рэгістрацыі замежнага грамадзяніна партнёрскаму падраздзяленню неабходна прадаставіць у АВІР УУС Мінгарвыканкома пісьмовае хадайніцтва, падпісанае рэктарам у трох экземплярах (1 — у АВІР, 1 — ва ўпраўленне па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкома, 1 — ва ўпраўленне па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта).

(Заўвага: Па рашэнню Мінскага гарадскога савета № 387 ад 08.06.1994 за кожны дзень знаходжання замежнага грамадзяніна ў г.Мінску на рахунак Мінгарвыканкома ўносіцца 10% ад мінімальнага заробку.)

Каштарыс выдаткаў на знаходжанне замежнага спецыяліста складаецца ў адпаведнасці з нормамі, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь.

Праграма прыёму візіруецца ва ўпраўленні па міжнародных сувязях універсітэта, 1-ым аддзеле і зацвярджаецца рэктарам (прарэктарам) універсітэта.

Каштарыс выдаткаў візіруецца ва ўпраўленні па міжнародных сувязях, бухгалтэрыі і зацвярджаецца рэктарам (першым прарэктарам) універсітэта.

Адзін экземпляр каштарысу і праграмы прыёму прадастаўляецца ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта.

У тыднёвы тэрмін пасля заканчэння знаходжання спецыяліста падраздзяленне, якое прымала яго, прадастаўляе ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта справаздачу аб зробленай рабоце, адзін экземпляр фінансавай справаздачы (папярэдне фінансавая справаздача прадастаўляецца ў бухгалтэрыю).

Спецыялісты, запрошаныя для выканання рабочай праграмы, для праходжання рознага кшталту стажыровак, для чытання лекцый, могуць залічвацца на пасаду, адпаведную іх кваліфікацыі, у тое падраздзяленне (факультэт, кафедру), якое іх прымае.

Замежныя спецыялісты, запрошаныя для чытання лекцый, могуць залічвацца на адпаведную пасаду з пагадзіннай аплатай за кошт падраздзялення, якое іх прымае.

Падаходны падатак і іншыя вылікі з заробку замежнага спецыяліста не робяцца.

Выдаткі па запрашэнню ўдзельнікаў міжнародных канферэнцый, якія праводзяцца на базе Белдзяржуніверсітэта, нясе аргкамітэт гэтай канферэнцыі, калі іншае не агаворана дадаткова ў рамках міжвузаўскіх дагавораў БДУ.

Запрашэнне ў Белдзяржуніверсітэт замежных спецыялістаў факультэтамі, кафедрамі, іншымі падраздзяленнямі, асобнымі супрацоўнікамі без дазволу рэктара і ўзгаднення з упраўленнем па міжнародных сувязях універсітэта не дапускаецца.

***6 раздзел. Прапановы аб парадку адпраўлення міжнароднай карэспандэнцыі***

Белдзяржуніверсітэт бярэ на сябе выдаткі, звязаныя з адпраўленнем пісьмовай міжнароднай карэспандэнцыі (поштай, факсам) у рамках заключаных дагавораў аб міжвузаўскім супрацоўніцтве, праграм супрацоўніцтва факультэтаў, кафедраў, карэспандэнцыі рэктарата, упраўлення па міжнародных сувязях універсітэта.

Выдаткі па адпраўцы міжнароднай карэспандэнцыі ў рамках абмену навуковай інфармацыяй факультэтаў, кафедраў, асобных супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта могуць ажыццяўляцца за кошт сродкаў, выдзеленых для навуковых даследаванняў па дадзенай тэматыцы.

Выдаткі па адпраўцы міжнароднай карэспандэнцыі ў рамках падрыхтоўкі навуковых канферэнцый, якія адбываюцца на базе Белдзяржуніверсітэта, нясе аргкамітэт рыхтуемай канферэнцыі.

Захаванне неабходных фармальнасцей пры адпраўцы міжнароднай карэспандэнцыі поштай забяспечваецца канцылярыяй універсітэта. Парадак адпраўкі міжнароднай карэспандэнцыі факсам, электроннай поштай вызначаецца загадам рэктара.

*Гасцёўня*

# "Творчасць нашых пісьменнікаў належыць перш за ўсё беларускай літаратуры і адрасуецца беларусам."

***У лістападзе спаўняецца год з дня ўтварэння Беларускага літаратурнага саюза "Полацкая галіна" ("Полоцкая ветвь"). Для таго, каб даведацца, што адбылося за год, а таксама бліжэй пазнаёміць нашых чытачоў з дзейнасцю гэтай арганізацыі, мы вырашылі паразмаўляць з адным з заснавальнікаў "Полацкай галіны" Алегам Зайцавым.***

**— Ці існавалі раней арганізацыі, падобныя да вашай?**

— Паводле маёй інфармацыі, толькі адна юрыдычна зарэгістраваная — Саюз пісьменнікаў Беларусі. Існуе, праўда, яшчэ ~~Саюз пісьменнікаў~~-марыністаў, але я не чуў аб іх дзейнасці. Можна сказаць яшчэ аб пары-тройцы арганізацый, якія прэтэндуюць на статус рэспубліканскіх, напрыклад, "Таварыства вольных літаратараў".

**— Чым прынцыпова адрозніваецца "Полацкая галіна" ад афіцыёзнага Саюза пісьменнікаў?**

— Перш за ўсё — мовай. А яшчэ — стаўленнем да творчасці. Для ўступлення ў літсаюз, у адрозненне ад Саюза пісьменнікаў, зусім неабавязкова мець апублікаваныя творы, дастаткова, каб яны былі вартыя таго.

**— Вернемся да пытання аб мовах. Чаму прыярытэтнай з'яўляецца руская?**

— Асноўнай мэтай стварэння БЛС "Полацкая галіна" была і застаецца падтрымка беларускіх пісьменнікаў, якія пішуць па-руску.

**— Гэта не парадокс? Рускамоўны беларускі пісьменнік?**

— Як паказвае жыццё, не парадокс. Творчасць нашых пісьменнікаў належыць перш за ўсё беларускай літаратуры і адрасуецца беларусам.

**— 18 лістапада "Полацкай галіне" спаўняецца год. Ці ёсць канкрэтныя вынікі дзейнасці літсаюза?**

— Гледзячы, аб якіх выніках весці гаворку. "Полацкая галіна" дала парасткі па ўсёй Беларусі. У кожнай з шасці абласцей ёсць сваё рэгіянальнае аддзяленне. Апрача таго, аддзяленні ёсць у некаторых буйных гарадах: Барысаве, Бабруйску, Полацку, Баранавічах, Оршы, Кобрыне, г.зн. наша арганізацыя заўважана пішучай брацiяй.

Што ж тычыцца поспехаў творчых, дык тут вынікі больш сціплыя. І ў гэтым віна не "галінаўцаў" ці кіраўнікоў літсаюза, а бяда нашага грамадства, у якім дарэшты адсутнічаюць традыцыі фундатарства і дабрачыннасці. Акром трох аўтарскіх зборнікаў: А.Барадача "Прежде ненависти", П.Сямінскага "Сказки далёких планет" і А.Раткевіча "Пятерица" (што, па-гадзіцеся, няшмат) — мы не можам пахваліцца нічым.

**— Творчыя людзі непрадказальныя. Ці ўсё задавальняла паэтаў у літсаюзе, ці не было тых, хто захацеў пакінуць "Полацкую галіну"?**

— Былі. З 38 дэлегатаў установўчага з'езду ў лік заснавальнікаў увайшлі толькі 23. Дый на працягу года былі выключаныя некалькі чалавек.

**— Ці не маглі б Вы назваць прычыны выключэння?**

— Яны розныя: дзеянні, несумяшчальныя са званнем члена літсаюза, парушэнне статута, творчая бяздзейнасць.

**— Сярод студэнтаў, я ўпэўненая, ёсць шмат пішучых. Як яны могуць звязацца з вамі?**

— Паэтаў мінскага аддзялення можна знайсці ў рэдакцыі газеты "Знамя юности" па аўторках у 18.30. Для таго ж, каб уступіць у "Полацкую галіну", трэба напісаць заяву, запоўніць анкету, прынесці свае творы. Апрача гэтага, трэба мець рэкамендацыі ад двух "галінаўцаў".

**— А ці ёсць у літсаюзе выпускнікі БДУ?**

— Так. Яны нават займаюць кіруючыя пасты. Гэта — старшыня А.Раткевіч ( ён скончыў філфак), а я і старшыня мінскага аддзялення А.Барадач скончылі журфак.

**— Як вы мяркуеце, ці ёсць будучыня ў літсаюза?**

— Хацелася б верыць, што наша галінка зазелянее насуперак таму, што ўмовы для гэтага неспрыяльныя.

***Размаўляла Юлія Васілішына***

*Гэта яшчэ трэба зразумець*

ПРОДАМ:

* Кондиционеры "Последний вздох", обеспечивающие вакуум в помещении за 8 секунд

* чайный сервиз "Чефир", кофейный сервиз "Кефир", суповой сервиз "Взахлеб", шашлычницу "Пекло"

* 2-томник "Жемчужины народной глупости"

* велосипеды "Школьник", "Студент", "Аспирант", "Декан"

* новую раковину ушную, белую, фарфоровую

* щенков средне-азиатской, южно-африканской, дальне-мавританской овчарок, а также породы русская блатная

* отрез джинсовой ткани на унты

* вьетнамки (Вьетнам), чешки (Чехия), бурки фасонные (Буркина-Фасо) и валенки (Валька на комиссию принесла)

* деньгосос "Рэкет"

* камуфлированный ватник на подкладке из рубероида

* матюки - оптом, на все случаи жизни

* деревянные галстуки с булавкой-шишечкой и застежкой-белочкой

* черно-белый телевизор "Радуга"

* боксерские перчатки из лебяжьего пуха

* радиотелефон для глухих

* Холодильник "Африка-8"

* сапоги растворимые

* тумбочку под пианино

* велосипед Десна-2 с рулем Гланды-3

* трубопровод Уренгой-Помары-Ужгород, самовыкоп

* прыщи противокомариные в инъекциях

* чайник с одной ручкой, двумя носиками и тремя ротиками, глазки отсутствуют

* телевизоры черно-белые, красно-синие, жовто-блакитные

* новый твердый уголок

* мочалку с программным управлением

* бензопилу "Вражда"

* шарф металлический

* сигареты на розлив

* сборный ж/б дом 7x10 м, 2 этажа, 5 комнат, 3 крыши, 8 входов (5 черных, 2 белых и 1 парадный), 3 входа с турникетами и 6 со шлагбаумами, 17.5 окон с видом на погреб, гараж на 3 экскаватора, за домом спиральная взлетно-посадочная полоса для бумажных самолетиков и песочница 9x12 м, наполненная гравием, дом собирается 3-мя поколениями

* вязальную машину "Нева-ДА" для вязания морских узлов

* подзорную водосточную трубу

* слуховые аппараты (стерео, с эквалайзером и возможностью повторить услышанное)

* лакированные ласты на высоком каблуке

* гроб двуспальный

* щенков нем.овчарки в рулонах 15 кв.м

* указатели поворота домашние (есть дикие)

* обручальное кольцо в нос

* долбательную машинку "Дятел"

* сигареты импортные с низкочастотным фильтром и автоматическим впрыском никотина в легкие

* партию импортных отходов

* волосы цвета заката на о.Хонсю (мин.партия 30 шт.)

* оконную замазку Donald

* норковую шубу, стриженную под "ноль"

* бублик-гум из натурального московского ГУМа

* цветной фото-альбом "Пизанская башня", башлять в пизанях

* мягкий уголок оцинкованный 1x1x1 с набивкой из шатунных вкладышей и коренных австралийских подшипников

* офицерские хромовые сапоги с лыжным креплением

* полиэтиленовый плащик от дождя на меху

* дробь барабанную

* пиш.машинку Ятрань: рус.шрифт, широкая каретка, широкие клавиши. Классная вещь, но почерк ужасный

* кобель, боксер, силовой 3-жильный

* баян на запчасти

* дет.коляску "Мальвина", дет.горшок "Буратино" и подгузники "Папа Карло"

* сифон и таблетку Трихопол к нему

*очень мягкий уголок "Продавлинка"

* пианино Украина -- 5 Мгб памяти

* ванночку детскую с центрифигой







Малюнкі Опрчича Кромешнего




БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная змена" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

26 кастрычніка
Зак. 662.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.

В.а. рэдактара Т.М. Казак